# УРОК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў 6-М КЛАСЕ. СЯРГЕЙ ТАРАСАЎ. "ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ"



**Сасноўская Валянціна Мікалаеўна,**
*настаўнік*
*беларускай мовы і літаратуры*
*вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі*
*ДУА "Сярэдняя школа № 8 г. Полацка"*

*Дадзены ўрок з'яўляецца заканамерным працягам знаёмства вучняў з адлюстраваннем у літаратуры гістарычнай тэмы (раздзел "Покліч мінулых стагоддзяў").*

*Урок пабудаваны з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцяў вучняў, а таксама патрабаванняў вучэбнай праграмы па прадмеце. Змест адабранага матэрыялу характарызуецца даступнасцю, навізной, адлюстраваннем каштоўнасных арыенціраў, міжпрадметных сувязей, неабходнасцю выкарыстання актыўных метадаў і прыёмаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці (тэхналогіі інтэрактыўнага навучання, ІКТ) і арыентаваны на дасягненне асобасных, прадметных і метапрадметных вынікаў.*

**Тэма ўрока: Сяргей Тарасаў. "Ефрасіння Полацкая"**

***Навучальныя мэты ўрока:*** мяркуецца, што да канца ўрока вучні:

– пашыраць і паглыбяць веды пра беларускую асветніцу і святую Еўфрасінню Полацкую, засяродзіўшы ўвагу на часе і месцы дзеяння ў творы, дзейнасці манахіні;

– асэнсуюць веліч постаці асветніцы, яе ролю ў беларускай гісторыі і культуры;

– будуць валодаць уменнямі спасцігаць карціны, вобразы, фарбы ў гістарычным творы, параўноўваць блізкія па тэме творы розных відаў мастацтва.

***Метапрадметныя мэты:*** фарміраванне:

– вучэбна-кіраўнічых кампетэнцый (уменне фармуляваць мэту і задачы ўрока, уменне размяркоўваць свой рабочы час, уменне даць адэкватную ацэнку сваёй дзейнасці);

– інфармацыйных кампетэнцый (уменне знайсці і захаваць патрэбную інфармацыю);

– універсальна-лагічных (уменне параўноўваць, аналізаваць, абагульняць, групіраваць, рабіць вывады, здольнасць разумець пастаўленыя пытанні, самастойна фармуляваць свае думкі, лагічна разважаць);

– камунікатыўных (уменне прадстаўляць інфармацыю ў вуснай і пісьмовай форме, уменне ўступаць у дыялог, калектыўна абмяркоўваць пытанні).

***Задачы асобаснага развіцця і выхавання:***

– стварыць спрыяльныя ўмовы для асэнсавання новай інфармацыі;

– садзейнічаць актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці, выхаванню культуры пошукавай працы (індывідуальнай, парнай, групавой);

– садзейнічаць выхаванню ў вучняў цікавасці і павагі да гісторыі роднага горада, гонару за слынную зямлячку.

***Форма правядзення:*** урок-дыялог з выкарыстаннем элементаў тэхналогіі інтэрактыўнага навучання і ІКТ.

***Тып урока:*** урок вывучэння новага матэрыялу.

***Абсталяванне:*** тэлевізар, ноўтбук, прэзентацыя, відэаролік, раздатачны матэрыял, ілюстрацыйны матэрыял (рэпрадукцыі здымкаў Е. Полацкай, Сафійскага сабора, Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, помніка Е. Полацкай), лісты самаацэнкі вучэбных дасягненняў.

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны этап (1 хв.)**

***Плануемы вынік:*** стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага настрою вучняў.

***Педагагічная задача:*** арганізаваць і падрыхтаваць вучняў да ўрока.

***Дзейнасць настаўніка:***

1. Садзейнічае стварэнню добразычлівай атмасферы, дысцыпліны на ўроку.

Старажытныя грэкі казалі: “Добры настрой – палова перамогі”. Давайце шчыра ўсміхнёмся адзін аднаму. А я хачу пажадаць вам цудоўнага настрою, добразычлівых адносін да тых, хто з вамі побач і, несумненна, актыўнасці і поспехаў на ўроку!

***Дзейнасць вучняў:***

Настройваюцца на вучэбную дзейнасць.

**II. Актуалізацыйна-матывацыйны этап (да 10 хв.)**

***Плануемы вынік:*** актывізацыя суб’ектыў-нага вопыту вучняў, пазнавальная матывацыя, самавызначэнне на вынік урока.

***Педагагічная задача:*** актуалізаваць апорныя веды і ўменні, сфарміраваць пазнавальны інтарэс да тэмы ўрока, стварыць умовы для самавызначэння вучняў на дзейнасць і яе выніікі.

***Дзейнасць настаўніка:***

1. Арганізуе працэс актуалізацыі апорных ведаў (метады “Завяршы думку”, “Лагічны ланцужок”).

2. Стварае вучэбныя сітуацыі для сумеснага мэтавызначэння, пастаноўкі вучэбных задач, арганізоўвае камунікацыю і дзейнасць вучняў, забяспечвае ўмовы для актуалізацыі міжпрадметных сувязей (метад “Бура прапаноў”).

***Дзейнасць вучняў:***

1. Прымаюць вучэбныя сітуацыі і заданні па актуалізацыі вучэбнага матэрыялу.

2. Удзельнічаюць у мэтавызначэнні, ассэнсоўваюць уласныя вучэбныя задачы і міжпрадметныя сувязі ў працэсе актуалізацыі апорных ведаў.

***1. Праверка дамашняга задання.***

– На мінулым уроку мы пазнаёміліся з жыццём Рагнеды. Давайце разам успомнім і скажам: хто яна? якая яна? (Прыкладныя адказы: Рагнеда – зямлячка, “славутая дачка полацкай зямлі”, паланянка, патрыётка, князёўна; прыгожая, свабодалюбівая, гордая.)

*Індывідуальнае заданне: ля дошкі стварыць тры лагічныя ланцужкі, абгрунтаваць логіку іх пабудовы. (Метад “Лагічны ланцужок”. Лагічныя ланцужкі: 1. Рагвалод – Рагнеда – Ізяслаў. 2. Полацк – Кіеў – Ізяслаўль. 3. Рагнеда – Гарыслава – Анастасія.)

***2. Знаёмства з новай тэмай. Мэтавызначэнне.***

– Сёння мы пазнаёмімся яшчэ з адной выдатнай асобай, нашай зямлячкай – Еўфрасінняй Полацкай, унучкай славутага князя Усяслава Чарадзея, якая засталася жыць у памяці нашчадкаў. І сёння мы з вамі здзейснім падарожжа ў далёкае XII стагоддзе…

– А што вы пра яе ведаеце з урокаў гісторыі, уласнага вопыту? (Метад “Бура прапаноў”).

– Як вы думаеце, ці дастаткова ў нас ведаў пра Е. Полацкую? (Не.) Тады якую задачу мы паставім перад сабой на ўроку? (Даведацца новае, паглыбіць і пашырыць свае веды на аснове знаёмства з творам С. Тарасава “Ефрасіння Полацкая” (запіс тэмы ў сшытку), а таксама рэпрадукцыяй карціны С. Лагуновіча-Чарапко.) Зараз я прапаную вам паглядзець відэаролік і значна пашырыць свае веды пра нашу славутую зямлячку. У выніку да канца ўрока мы павінны ўсвядоміць веліч постаці асветніцы, яе ролю ў беларускай гісторыі і культуры.

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап (да 25 хв.).**

***Плануемы вынік:*** засваенне ведаў па тэме ўрока.

***Педагагічная задача:*** арганізаваць мэтанакіраваную сумесную дзейнасць вучняў, забяспечыць пазнаваўчую актыўнасць.

***Дзейнасць настаўніка:***

1. Арганізоўвае працэс камунікацыі і калектыўнай сэнсатворчасці на ўроку (метад “2*4*6”).

2. Стварае вучэбныя сітуацыі, накіраваныя на дасягненне запланаваных задач урока.

***Дзейнасць вучняў:***

1. Выконваюць вучэбныя задачы (заданні) ў працэсе індывідуальнай і калектыўнай працы.

2. Самавызначаюцца ў вучэбнай сітуацыі, прымаюць і выконваюць пастаўленыя задачы ўрока.

**1. 1-я група** працуе з фрагментам тэксту (умоўная назва **“Дзяцінства”**) ад пачатку да сказа “Каму вады паднясе, каму слова ласкавае скажа…” (с. 190), (метад “2*4*6” па алгарытме “Хто? Дзе? Калі? Што?”). Кожны слухае адказы прадстаўнікоў іншых груп і запаўняе табліцу (першую калонку абавязкова):

| **Дзяцінства – юнацтва – сталасць** | |
|---|---|
| Чым займалася | Рысы |
| | |

– Як выглядалі вуліцы старажытнага горада? (“Высланыя бярвеннем, часам гнілыя і брудныя”, “…па вузенькіх вулачках...”)

– Што гэта быў за час? Дзе канкрэтна адбываюцца падзеі? (“Нясуць нястрымны людскі патоп да плошчы каля храма”, “Усіх склікае вечавы звон”, “Спяшаюцца кавалі, бронікі, гарбары… спяшаюцца бараніць сваю зямлю ад чарговай варожай навалы”, “Час у паход выступаць” (слайды прэзентацыі з выявай Верхняга замка, Сафійскага сабора, вуліц старажытнага горада).

– “А па вузенькіх вулачках горада спяшаецца дзяўчынка гадоў дзесяці. Гэта Прадслава”. Куды яна спяшаецца? Як яна ідзе? Чаму? (“Ідзе хутка і ўпэўнена – горад ёй знаёмы”, “яе ўсе ведалі”,

"лячыць параненых ваяроў", "з раніцы да вечара дапамагае цётцы Раманіі", "каму вады паднясе, каму слова ласкавае скажа").

**2-я група** працуе з фрагментам тэксту (умоўная назва **"Юнацтва"**) на с. 191–192 (ад сказа "Мінулі гады" і да "…давалі прытулак бедным людзям").

– "Мінулі гады. Падрасла Прадслава, пасталела". Што адбываецца далей у яе жыцці? Чаму яна не выйшла замуж? ("Яе бацька Святаслаў, родны брат полацкага князя Барыса, надумаў аддаць дачку замуж", "сышла да цёткі ў манастыр, каб прысвяціць сваё жыццё бедным і гаротным людзям".)

– Дзе спачатку жыла Еўфрасіння? Чым займалася? Які манастыр пабудавалі пад Полацкам? (Спаскі.) Хто яго пабудаваў? (Іаан.) Чаму цягнуліся сюды людзі? ("...многія імкнуліся аддаць сюды сваіх дачок".

– Якія справы сталі для Еўфрасінні важнымі і галоўнымі ў жыцці? ("...чытала і перапісвала кніжкі, якія па яе просьбе прадавалі, а грошы раздавалі бедным", стала настаяцельніцай манастыра, "вучыла дзяўчынак не толькі чытаць і пісаць, але і выконваць розную хатнюю работу: шыць, гатаваць ежу, вышываць і нават спяваць", "манашкі хадзілі ў лес па грыбы і ягады", "сваім набыткам яны дзяліліся з беднымі людзьмі, давалі прытулак падарожным".)

***Фізкультхвілінка** (інтэрактыўная гульня).

**3-я група** працуе з фрагментам тэксту (умоўная назва **"Сталасць"**) на с. 192–193 (ад слоў "Слава аб дабрадзейнасці Ефрасінні…" і да канца твора).

– "Слава ад дабрадзейнасці Ефрасінні разышлася далёка за межы Полацка". Дзе яе ведалі? (У Кіеве, Ноўгарадзе, у Візантыі.) Чаму? (За дабро.)

– Да чаго Еўфрасіння заклікала людзей? Якія яе павучэнні і запаветы трэба ведаць? ("...вучыла людзей паважаць адзін аднаго, заклікала спыніць братазабойчыя войны і княжацкія сваркі".)

– Колькі пражыла Еўфрасіння? ("...дакладна невядома".)

– Якая памяць аб ёй засталася ў нашым горадзе? (Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, вуліца, школа № 18 носіць яе імя, помнік, 5 чэрвеня – дзень ушанавання яе памяці.)

**2. Аналіз рэпрадукцыі карціны С. Лагуновіча-Чарапко "Еўфрасіння Полацкая"** (апераджальнае заданне).

На гэтай карціне Еўфрасіння знаходзіцца ў прыгожа прыбраным памяшканні. Думаецца, што яна нядаўна скончыла перапісваць кнігу і вырашыла адпачыць. Яе яшчэ малады твар звернуты да гледача. На стале знаходзіцца ўсё, што ёй неабходна для работы: кнігі, аркушы паперы, скручаныя ў трубачку, чарніліца з пяром, малітвеннік. З акна бачыцца Спаса-Праабражэнская царква. Скрозь невялікія акенцы ў памяшканне льецца сонечнае святло. Мастак паказаў прыгожае ўбранне, посуд, кветкі. Толькі постаць Еўфрасінні Полацкай стрыманая, строгая. Погляд яе вялізных, бяздонных вачэй гаворыць пра вялікую духоўную сілу, рашучасць і ў той жа час яны свецяцца любоўю і дабрынёй.

– Што ва ўспрыняцці мастака і пісьменніка агульнае? (стварэнне вобраза маладой, адукаванай жачыны, асветніцы, дабрачынніцы, настаўніцы, гуманісткі).

**IV. Кантрольна-ацэначны этап (да 7 хв.).**

***Плануемы вынік:*** выяўленне вучнямі ўзроўню вучэбных дасягненняў.

***Педагагічная задача:*** арганізаваць ацэнку ўзроўню ведаў.

***Дзейнасць настаўніка:***

1. Прапануе сістэму і крытэрыі ацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці (складанне кластара).

2. Ацэньвае працэс і вынікі вучэбнай дзейнасці.

***Дзейнасць вучняў:***

Прымаюць сістэму і крытэрыі ацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці.

***Калектыўнае складанне кластара*** "Хто яна?" на аснове запоўненай табліцы.

– Усё, што яна рабіла, давайце падвядзём пад тры пункты і назавём "Сэнс жыцця Е. Полацкай" (1. Служэнне людзям. 2. Развіццё асветы. 3. Вучэнне хрысціянскай мудрасці.)

***Заключнае слова настаўніка.***

У Евангеллі ёсць цудоўная прытча пра сейбіта, які ранняй вясной выйшаў у поле, каб пасеяць зерне. Ідзе сейбіт па свежых барознах і старанна рассейвае насенне. Частка зерня падае пры дарозе, частка – на камяністую глебу ці ў зямлю, зарослую калючкамі. Але тое, што ўпала на добрую глебу, дасць у сто раз багацейшы ўраджай. Вось такім першым сейбітам духоўнага насення была наша славутая Прадслава са слаўнага горада Полацка, якая ў XII стагоддзі зразумела вялікую ролю асветы ў жыцці народа і аддала гэтай справе ўсе свае сілы.

**V. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

***Педагагічная задача:*** забяспечыць разуменне зместу і спосабаў выканання дамашняга задання (пыт. 9 (с. 204), запісаць асацыяцыі да слова "Еўфрасіння" або скласці сінквейн).

**VI. Этап рэфлексіі (да 2 хв.).**

***Педагагічная задача:*** арганізаваць рэфлексію вучнямі сваёй дзейнасці на ўроку (запаўненне лістоў самаацэнкі вучэбных дасягненняў на ўроку).

**Дадатак**

**Ліст самаацэнкі вучэбных дасягненняў на ўроку**

**Прозвішча, імя** ___________________

| Веды і ўменні | Так | Часткова | Не |
|---|---|---|---|
| Зразумеў змест твора С. Тарасава "Ефрасіння Полацкая" (Хто? Што? Дзе? Калі? Чаму?) | | | |
| Умею працаваць з тэкстам (умею знайсці і захаваць патрэбную інфармацыю) | | | |
| Умею фармуляваць мэту і задачы ўрока | | | |
| Умею прадстаўляць інфармацыю ў вуснай і пісьмовай форме | | | |
| Умею ўступаць у дыялог, калектыўна абмяркоўваць пытанні | | | |
| Умею вызначаць рысы характару гераіні на аснове яе ўчынкаў, паводзін | | | |
| Умею састаўляць кластар | | | |
| Умею аналізаваць, абагульняць, рабіць вывады, самастойна фармуляваць свае думкі, лагічна разважаць | | | |
| Спасцігнуў змест відэаroліка | | | |
| Умею супаставіць вобразы Е. Полацкай у празаічным творы і рэпрадукцыі карціны С. Лагуновіча-Чарапко "Ефрасіння Полацкая" | | | |
| Разумею ролю Е. Полацкай у беларускай гісторыі і культуры | | | |
| Умею даць адэкватную ацэнку сваёй дзейнасці | | | |